# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі*
# III клас

***Блішчаць.***

***1.*** *Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

,,,   ,, ць

______________________________

У дужках укажыце колькасць гукаў і колькасць літар у слове.

***2.*** *Дапоўніце верш патрэбным словам.*

Абходзіць верасень лясы
з няпамятных часоў.
Тырчаць-тапырацца вусы — блішчаць
з блакітных верасоў.

Таемнай сцежкаю ідзе — блішчыць
пад ветру спеўны свіст.
_____________ у доўгай барадзе
зжаўцелы першы ліст. *(М. Мятліцкі* [1, с. 41])

*Падкрэсліце ў першым сказе дзейнік і выказнік.*

***3.*** *Прачытайце. Дапоўніце верш патрэбнымі слоўнікавымі словамі. Пра якое свята ідзе размова ў вершы? За што атрымаў узнагароды прадзед хлопчыка?*

Праўнук Перамогі

Іду я з прадзедам сваім,
іду на свята Перамогі.
Дзядуля ў фрэнчы франтавым, — медалі
даўно пажухлым,
ды зусім — блішчаць
не пацямнелі ўзнагароды-
і ордэны, і _______
_____________, як сонейкі, як зоры,
нібыта іх яму далі
не шмат гадоў таму, а ўчора.
*(І. Муравейка* [1, с. 22])

Фрэнч — прыталеная куртка ваеннага крою з чатырма накладнымі кішэнямі і хлясцікам ззаду.

***4.*** *Дапоўніце вобразны выраз слоўнікавым словам. Злучыце выраз з яго значэннем.*

**толькі пяткі** _____________

| уцякаць вельмі хутка | бегчы павольна | ісці пешшу |
|---|---|---|

*Прачытайце размову маці з сынам.*

Маці зірнула ў акно. Яна запыталася ў Алеся:

— Ад каго гэта твой сябар Мішка так ўцякае?

Алесь падбег да акна:

— Гэта, відаць, ён ішоў да мяне ў госці, убачыў каля дома суседскага Рэкса, спужаўся і пабег. Глянь, **як хутка ўцякае** (______________)! Пабягу яму на дапамогу, скажу, што Рэкс не пакрыўдзіць.

*Які выраз мог выкарыстаць Алесь замест слоў* ***хутка ўцякае****? Дапішыце гэты выраз у дужках.*

***5.*** *Прачытайце. Дапішыце слоўнікавае слова, блізкае па значэнні да прапанаваных слоў.*

Ззяць, бліскаць, зіхацець, ірдзець, ___________.

***6.*** *Прачытайце. Якія словы ў вершы «пераблыталіся»? Прачытайце верш правільна.*

На траве
Блі..ыць каса,
Свішча
Вострая раса. *(Пятро Сушко* [2, с. 143])

*Дапішыце ў слоўнікавае слова патрэбныя літары.*

***Шчасце.***

***1.*** *Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова.*

 " С  "'"

__________________

*Падкрэсліце тыя словы, якія з'яўляюцца антонімамі да слоўнікавага слова.*

Бяда, гора, дабро, ліха, радасць.

***2.*** *Прачытайце. Дапоўніце верш слоўнікавым словам. Якія пачуцці да роднага краю перадае паэтэса ў творы.*

Родны край

Родны край — дарагі, ненаглядны,
прыгажэйшай не знойдзеш зямлі!
Зеляненюць твае прысады,
залацяцца твае палі.

Я твайго радаводу галінка,
я і ў _________ і з табой і ў журбе.
Да апошняй жыццёвай сцяжынкі
буду, край мой, любіць я цябе.
*(Я. Жабко* [1, с. 19–20])

---

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

***3.*** *Прачытайце. Дапоўніце верш слоўнікавым словам.*

Мой край ясназорны! Прайшоў ты нямала
Шырокіх і вузкіх дарог.
І смутак, і гора цябе абнімала,
Ды ты іх пазбыў, перамог.

І новыя песні ў народзе звінелі,
Як голас юначкі-вясны,
І засевы ________я вакол зарунелі —
Збываліся мары і сны. *(Я. Колас)*

*Пазбыў — вызваліўся.*
*Засéвы — пасéвы.*
*Зарунéлі — узышлі і зазелянелі.*
*Знайдзіце і падкрэсліце ў вершы антонімы.*

***4.*** *Прачытайце. Дапоўніце верш слоўнікавым словам.*

Мудрых многа кніг на свеце,
І скажу вам па сакрэце:
Ключык __________я залаты
Прыхаваны ў кнігах тых.
*(М. Пазнякоў* [3, с. 55]*)*

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.*

***5.*** *Прачытайце словы. Дапішыце патрэбныя літары на месцы пропускаў.*

Шчас..е, ..аслівы, ..асціць.

*Дапоўніце скорагаворку патрэбным словам з прапанаваных.*

Хто кніжку любіць і шануе,
Таму і ____________, і шанцуе.
*(М. Пазнякоў* [3, с. 51]*)*

***6.*** *Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?*

Кветка цягнецца да сонца, а чалавек да шчас..я [2, с. 4].

*Дапішыце патрэбную літару на месцы пропуску.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 279 с., іл.
2. Акрайчык : чытанка для 1–2 кл. / уклад. Г. Каржанеўская, М. Яфімава. — Мінск : Народная асвета. — 1995. — 176 с.
3. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://modelist-konstruktor.com/wp-content/uploads/2012/07/0-13.jpg; http://www.raskraska.com/catalog0001/7230.gif; http://www.raskraska.com/catalog0001/7230.gif; http://www.domdt.info/upload/medialibrary/27f/lepka-iz-solenogo-testa.jpg

## Рэкамендацыі па выкарыстанні «Каляровага слоўніка»

З № 12 2017 г. па № 5 2018 г. у часопісе на каляровай укладцы прапанаваны слоўнікавыя словы, прадугледжаныя для засваення вучэбнай праграмай у III класе. У гэтым нумары часопіса на каляровай укладцы прадстаўлены рукапісны варыянт усіх слоўнікавых слоў разам з малюнкамі-апорамі. Літары арфаграм у словах падаюцца курсівам і выступаюць часткай малюнка-апоры.

Рукапісны варыянт слоўнікавых слоў пажадана раздрукаваць для кожнага вучня ў класе. У такім выпадку паслядоўнасць выкарыстання малюнкаў-апор можа быць наступнай:

1. Пасля знаёмства са слоўнікавым словам і вылучэння ў ім неправяраемай або цяжка правяраемай арфаграмы ўвага вучняў звяртаецца на малюнак-апору.

2. Настаўнік прапануе вучням абвесці літару неправяраемай арфаграмы ў рукапісным варыянце слоўнікавага слова з мэтай стварэння зрокава-рухальнага вобразу слова.

Па меры вывучэння слоўнікавых слоў вучні па жаданні могуць расфарбоўваць адпаведныя малюнкі.

Такім чынам, у кожнага вучня з'явіцца «Каляровы слоўнік», які можна выкарыстоўваць не толькі падчас знаёмства са слоўнікавым словам, але і для паўтарэння і замацавання правапісу раней вывучаных слоў.

***Свірыдзенка В. І.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*